ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



ЛІПЕНЬ

Віцебск 2014

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Ліпень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК
2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : ліпень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 22 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014

**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Ліпень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Адказны за выпуск А. І. Сёмкін
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

**ЗМЕСТ**

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………………4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 ліпеня 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.



час **Міжнароднага фестывалю славянскіх народаў “Славянское единство-2014”** на мяжы Гомельскай, Чарнігаўскай і Бранскай абласцей. Паэтэса расказала прысутным пра Віцебшчыну, яе гістарычныя і культурныя помнікі, турыстычныя праграмы, якія рэалізуюцца на тэрыторыі краіны і вобласці, падарыла выданні на гэту тэму, літаратурны альманах “Дзвіна”, а таксама прачытала вершы.

*Витебский проспект. – 2014. – 10 июля. – С. 3.*

Навучэнцы фартэпіяннага аддзялення ДШМ № 3 г. Барані *Дзіяна Рудакова* і *Кірыл Атрошчанка* ў сакавіку прымалі ўдзел у **V Міжнародным конкурсе “Культурная сталіца-2014”** у г. Санкт-Пецярбургу (Расійская Федэрацыя) і былі адзінымі прадстаўнікамі Беларусі. Юныя піяністы ўзнагароджаны дыпломам лаўрэата II ступені ў намінацыі “ансамблі”.

*Аршанская газета. – 2014. – 8 ліп. – С. 1.*

*Т. Кабяк* і інш.

*http://news.tut.by/culture/405992.html*

**11 ліпеня** ў рамках праекта “Тэатр на пленэры” ў музеі-сядзібе І. Рэпіна “Здраўнёва” прайшоў начны паказ трагедыі “Макбет” у пастаноўцы *В. Анісенкі*, прысвечаны 450-годдзю У. Шэкспіра. У спектаклі заняты акцёры *Ю. Цвірка, А. Баркоўская, Г. Лойка, Я. Берасней, В. Цвяткоў, І. Тышкевіч, Я. Лук’янаў*, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь *Р. Шацько*

*http://kolastheatre.by/ru/news/tragediya-pod-nochnym-nebom*

*МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК*

**21 чэрвеня** на тэрыторыі помніка архітэктуры XIX стагоддзя – былой сядзібы Манькоўскіх, што знаходзіцца ў аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна, адбылося **раённае свята гульняў і ігрышчаў “Мазалаўскі карагод гульняў-2014”**. Сёлета яно праводзілася ў рамках святкавання Года гасціннасці і было прысвечана 425-годдзю першай згадкі пра мястэчка Мазалава. Гасцямі свята сталі ўдзельнікі дэлегацыі з аграгарадка “Мазалава” Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці (сустрэча адбылася ў рамках праекта па культурным супрацоўніцтве паміж аднайменнымі населенымі пунктамі “Сцяжынкамі мазалаўскіх святынь: ад Віцебска да Магілёва”). У час свята можна было наведаць майстэрню работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва майстроў раённага Цэнтра рамёстваў “Адраджэнне” і магілёўскіх рамеснікаў, пакаштаваць мазалаўскія прысмакі, вымнянскую юшку… Госці і ўдзельнікі свята ўбачылі вясельны абрад, які выканаў народны ансамбль народнай песні і музыкі “Вераснянка”.

*http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&DomainName=cult&id=10402&mode=print*

У канцы чэрвеня Старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Т.І. Краснова-Гусачэнка прыняла ўдзел у рабоце круглага стала пісьменнікаў славянскіх дзяржаў, што прайшоў у





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

#### АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджана намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра культуры “Віцебск“ па спецыяльных прэктах *Марына Генадзьеўна Раманоўская*.

*Витебский проспект. – 2014. – 1 июля. – С. 1.*

У горада Віцебска з’явіўся яшчэ адзін, 19-ты, горад-пабрацім. У дні святкавання 1040-годдзя абласнога цэнтра быў падпісаны дагавор аб пабрацімскіх сувязях з г. Ліпецкам (Расійская Федэрацыя).

*Витебский проспект. – 2014. – 1 июля. – С. 2.*

**3 і 4 ліпеня** ў Віцебску ў святочных мерапрыемствах, прысвечаных **Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь** і **70-годдзю вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**, прынялі ўдзел больш за 10 тысяч чалавек. Святкаванне пачалося з урачыстага ўскладання кветак да мемарыяла “Вызваліцелям Віцебска – савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам” і мітынгу з удзелам кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама і гарвыканкама, іншых афіцыйных асоб, прадстаўнікоў моладзі, грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў. Затым адбылося тэатралізаванае шэсце, якое змянілася канцэртам творчых калектываў горада. Удзел у ім прынялі: заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь харэаграфічны ансамбль “Зорка”, студыя эстраднага танца “V.I.P.”, арт-група “D.V.O.Rы”, шоу-балет “Сенсацыя”, харэаграфічны калектыў Віцебскага каледжа культуры і мастацваў, узорныя ансамблі спартыўнага бальнага танца “Фэст” і “Мазаіка” Цэнтра культуры “Віцебск”, ансамбль танца, музыкі і спеваў “Талака”, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь “Лявоніха” і інш. Забаўляльныя

праграмы былі праведзены ў Парках Пераможцаў, Савецкай Арміі, культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”», КДЦ “Першамайскі”. У пешаходнай зоне на вуліцах Пушкіна і Суворава разгарнулася выстаўка-кірмаш работ віцебскіх мастакоў і народных майстроў, навучэнцаў ДШМ і ДМШ. Заключным акордам урачыстасцей стаў канцэрт творчых калектываў Цэнтра культуры “Віцебск” і расійскай групы “Прэм’ер-міністр”, які завяршыўся рэспубліканскай патрыятычнай акцыяй “Спяём гімн разам”. З нагоды свята ў вобласці паўсюдна адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы, прайшлі мітынгі, патрыятычныя акцыі і канцэрты мастацкай самадзейнасці.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 8 июля. – С. 1, 4.*

З **3** па **5 ліпеня** ў г. Глыбокае прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя 600-годдзю населенага пункта. У рамках святкавання адбылося адкрыццё ў скверы вядомых землякоў скульптуры прафесара, доктара тэхнічных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, аўтара праекта “Будаўніцтва мінскага метрапалітэна” Юрыя Сабалеўскага, які прымаў актыўны ўдзел у вызваленні Глыбокага ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Усталявана Дошка славы ў гонар дзевяці глыбачан – Герояў Сацыялістычнай Працы, прайшла акцыя “Бессмертный полк” ва ўрочышчы Барок, тэатралізаванае шэсце “Глыбокае. Старажытнае і маладое” і іншыя мерапрыемствы.

**6 ліпеня** ў юбілейны, 55-ты раз у Верхнядзвінскім раёне на стыку дзяржаўных граніц Беларусі, Расіі і Латвіі на Кургане Дружбы адбылася сустрэча людзей розных нацыянальнасцей і ўзростаў з мэтай ушанаваць памяць тых, хто вызваляў родную зямлю ад нацызму. У час мерапрыемства прайшла цырымонія закладкі капсулы з пасланнем нашчадкам, а таксама святочны канцэрт творчых калектываў УП “Віцебскаблгаз”.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 8 июля. – С. 4.*



мерапрыемства, прысвечанае 170-годдзю з дня нараджэння мастака “Ильин день”.

У **ліпені** на сесіі Віцебскага гарадскога савета быў асветлены ход рэалізацыі праграмы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Віцебска на 2012–2015 гады. Былі разгледжаны праблемы, звязаныя з недахопам фінансавання, факты парушэння закона аб ахове гістарычных і культурных каштоўнасцей, зацверджаны змены ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей і інш.

*Витебский проспект. – 2014. – 8 июля. – С. 2.*

## МАСТАЦТВА

### *ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

Традыцыйная міжнародная фотавыстаўка “Мир глазами женщин”, якой сёлета споўнілая 5 гадоў, упершыню экспанавалася ў Віцебску. Частка юбілейнай экспазіцыі была прадстаўлена ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”». У праекце прынялі ўдзел новыя аўтары з Германіі, Украіны, Канады і краін Балтыі, беларускія фотамастачкі з г. Віцебска і Гродна.

*Витебский проспект. – 2014. – 24 июля. – С. 16.*

У культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”» працавала аўтарская выстаўка работ члена Саюза мастакоў Беларусі *Аляксея Пшонкі*. На ёй было прадстаўлена больш за 25 работ аўтара.

### *ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа **7 ліпеня** адбыўся першы грамадскі прагляд спектакля “Дзікае паляванне караля Стаха” паводле аднайменнай дэтэктыўна-прыгодніцкай аповесці У. Караткевіча ў пастаноўцы *Ю. Лізянгевіча*. Галоўныя ролі ў спектаклі выконваюць *Я. Лук'янаў* і *Ю. Крашэўская*. У пастаноўцы таксама заняты акцёры *В. Дашкевіч*, *А. Фралоў*, *Ц. Жусупаў*,

Супрацоўнікі *Яноўскай сельскай бібліятэкі* запрасілі ў краязнаўчае падарожжа "Зямля, дзе пачаўся твой лёс".

У ліпені ў *Сенненскай ЦРБ* прайшла сустрэча з вядомым расійскім пісьменнікам, членам Саюза пісьменнікаў Расіі М.А. Трацяковым.

### *Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк*

Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у *цэнтральнай раённай бібліятэцы* прайшоў цыкл мерапрыемстваў пад назвай "Неделя памяти и славы фронтовой", у рамках якога адбыўся літаратурны вечар "Время уходит, с нами остаётся память", кніжная выстаўка "Войны священные страницы навеки в памяти людской" і інш.

**31 ліпеня** Акцыя ў цэнтральнай раённай бальніцы "Увага, узрост!" (*цэнтральная раённая і дзіцячая бібліятэкі*).

### *Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк*

**23 ліпеня** Сустрэча з расійскім паэтам, членам Саюза пісьменнікаў Расіі М.А. Трацяковым, прэзентацыя новай кнігі аўтара "Когда ложатся росы" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**27 ліпеня** Віктарына "Што я ведаю пра свой край", прысвечаная 90-годдзю з дня ўтварэння Шумілінскага раёна (*бібліятэка "Дабееўскі мох"*).

**27 ліпеня** Літаратурная гульня-падарожжа "Вас у казку добрую клічым" (*Светласельская сельская бібліятэка*).

## *МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

**7 ліпеня** ў Віцебску на вуліцы Пакроўскай у Доме-музеі Марка Шагала адзначылі 127-ю гадавіну з дня нараджэння мастака традыцыйным святам "В гостях у Марка и Беллы".

**28 ліпеня** ў сядзібе І. Рэпіна "Здраўнёва" прайшло



## *КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

З **3** па **8 ліпеня** ў Рыжскім цырку дэманстравалі сваё майстэрства юныя артысты з Латвіі , Літвы, Швецыі, Швейцарыі, Эстоніі і Беларусі. Рэспубліку Беларусь на Міжнародным цыркавым фестывалі для дзяцей і юнацтва "Мир полон чудес-2014" прадстаўляла цыркавая студыя "Фантазёры" ДУК "Аршанскі гарадскі Цэнтр культуры " пад кіраўніцтвам Святланы Раўкоўскай. Журы дастойна адзначыла высокі ўзровень падрыхтоўкі юных артыстаў, а кіраўніку студыі была ўручана грамата за высокапрафесійнае прадстаўленне цыркавых нумароў на міжнародным конкурсе.

*Телеком-экспресс (Орша). – 2014. – 31 июля. – С. 29.*

**8 ліпеня** ў беларускай дыпмісіі ў Маскве прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў чытацкага конкурсу на веданне літаратурна-мастацкіх твораў ваеннай тэматыкі, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго правядзенне ініцыіравала рэдакцыя газеты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі "Союзное вече". Сярод узнагароджаных браты *Георгій* і *Максім Архіпавы* з г. п. Шуміліна.

*Витебский проспект. – 2014. – 12 июля. – С. 7.*

З поспехам вярнуліся з г. Сартавала (Рэспубліка Карэлія) выхаванцы ўзорнага аматарскага ансамбля "Альтанка". На **V Міжнародным фестывалі-конкурсе "На берегах Ладоги"** з **2** па **6 ліпеня** яны заваявалі 9 узнагарод: два Гран-пры, чатыры дыпломы 1-й ступені, два – 2-й, адзін – 3-й ступені, прыняўшы ўдзел у конкурсах на лепшую эстрадную і духоўна-праваслаўную песню. Усяго ў мерапрыемстве прынялі ўдзел 70 вакалістаў з Фінляндыі, Расіі і іншых краін. "Альтанка" была адзіным калектывам, які прадстаўляў Беларусь.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 17 июля. – С. 1.*

**XVIII Міжнародны экалагічны фестываль "Спасти и сохранить"** у г. Ханты-Мансійску (Расійская Федэрацыя) прыцягнуў увагу грамадскасці да праблем навакольнага асяроддзя. Сваё слова на

фестывалі сказалі і дакументалісты з г. Віцебска – рэжысёр, аператар *Сяргей Махаў* і аўтар сцэнарыя *Наталля Саксонава*. Актуальны рэпартаж беларусаў "Нежелательный вид" прызнаны міжнародным журы лепшай публіцыстычнай праграмай.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 22 июля. – С. 2.*

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

У **пачатку** ліпеня ў Полацку прайшлі Дні яўрэйскай культуры. У рамках мерапрыемства адбыўся гала-канцэрт выканаўцаў яўрэйскай музыкі, адкрыццё фотавыстаўкі А. Шульмана "Яўрэйскае мястэчка", пешаходная экскурсія "Полацк яўрэйскі", мультымедыя-прэзентацыя пошукавага клуба "Людзі і лёсы" пра выдатных яўрэяў Полацка і раёна і інш.

*Полацкі веснік. – 2014. – 18 ліп. – С. 4.*

У гэтым годзе на Полаччыне ўпершыню рэалізуецца праект, накіраваны на захаванне і прапаганду купальскіх традыцый. Напярэдадні свята заняткі па традыцыйных харэаграфіі, вакале, гульнях, абрадах, а таксама майстар-класы па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве правялі ў "Школе купальскіх традыцый на Полаччыне", якая дзейнічае пры Раённым цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур. **6 ліпеня** на беразе возера Янова каля в. Бікульнічы адбылося маляўнічае свята народнага календара пад назвай "Лекавыя травы збіраем, Купалле вітаем".

*Полацкі веснік. – 2014. – 5 ліп. – С. 2.*

**5 ліпеня** калектыў мастацкай самадзейнасці Язненскага сельскага Дома культуры прыняў удзел у Рэспубліканскай выстаўцы-кірмашы народных рамёстваў "Беларускі сувенір".

**13 ліпеня** жыхары і госці в. Паташня Міёрскага раёна адзначалі свята вёскі. Акрамя мясцовых артыстаў сваю праграму прадставіў калектыў мастацкай самадзейнасці Дзісненскага ГЦК. У гэты ж дзень



***Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**6 ліпеня** Фальклорнае свята "Ля Купальскага вогнішча" (*Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб*).

**8 ліпеня** Свята кнігачэяў "В книгограде нет каникул" для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту (*Саланіцкая сельская бібліятэка*).

**17 ліпеня** Літаратурна-музычная кампазіцыя "70 лет уже минуло с начала той грозной войны" (*гарадская бібліятэка-філіял № 5*).

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**1 ліпеня** Віртуальнае падарожжа да помнікаў і абеліскаў "Прыйсці да Вечнага агню" для вучняў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту (*Лынтупская гарпасялковая бібліятэка*).

**2 ліпеня** Гутарка "Дзень Незалежнасці – свята гонару і славы", прысвечаная Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк***

Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь ва ўсіх бібліятэках сістэмы былі аформлены кніжныя выстаўкі "Беларусь мая, родны край", "Давайце ганарыцца, што мы беларусы", "Святое слова – Незалежнасць" і інш. У парку 40-годдзя Перамогі адбылося раённае свята "Во славу мёртвых и живых", прысвечанае 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, на якім супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* прадставілі сюжэтную пляцоўку "Вечны і непаўторны подзвіг Айчыны", бібліятэкары *дзіцячай бібліятэкі* арганізавалі гульнёва-забаўляльную праграму "Вясёлы калейдаскоп". Чытачы *Нямойтаўскай сельскай бібліятэкі* сабраліся на літаратурна-музычную кампазіцыю "Беларусь мая сінявокая". Урок мужнасці "У нашых сэрцах памяць аб кожным чацвёртым" прайшоў у *Багушэўскай гарпасялковай бібліятэцы*.

**27 ліпеня** Пазнавальная гульня “Войди в природу другом” (*дзіцячая цэнтральная бібліятэка*).

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**2 ліпеня** У рамках Дня памяці “Квітней, Беларусь!” у *Далёкаўскай сельскай бібліятэцы* адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя “Вайна вачыма дзяцей” і інфармацыйная гадзіна па кнізе “Памяць. Браслаўскі раён”).

**15 ліпеня** Відэаўрок “Хатынь – наш смутак і боль” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 ліпеня** Літаратурны лабірынт “Дорога к Победе” у рамках раённай акцыі “Прочти книгу о войне – стань ближе к подвигу” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**13 ліпеня** Тэатралізаванае прадстаўленне “Летучий корабль” (*Сушанская сельская бібліятэка*).

**20 ліпеня** Гульнёвая праграма “Праздник воздушных шаров” (*Забароўская сельская бібліятэка*).

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 ліпеня** адбылася акцыя “Франтавая бібліятэка”, прымеркаваная да святочных мерапрыемстваў у гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 70-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Увазе наведвальнікаў была прадстаўлена кніжная выстаўка-панарама “І выстаялі! І перамаглі!”, арганізавана экспазіцыя з прадметамі побыту таго часу, агляд кніг беларускіх і расійскіх аўтараў ваеннай тэматыкі. Наведвальнікі прынялі ўдзел у гістарычнай віктарыне “Вопросы из солдатского вещмешка”, музычным конкурсе “Любімыя франтавыя песні” і інш. (*цэнтральная раённая і дзіцячая бібліятэкі*).

**13 ліпеня** Свята лугавых кветак (*бібліятэка-музей аграгарадка Кавалі*).



адбылося і свята в. Дрыгучы. З канцэртнай праграмай завіталі да мясцовых жыхароў госці з Туркоўскага СДК.

*Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама*

**19 ліпеня** ў Глыбокім прайшоў другі па ліку **“Вішнёвы фестываль”**. У праграме свята быў тэматычны канцэрт, сямейны конкурс “В гостях у вишенки”, эстрадная дыскатэка “Вишневое лето” і нават “Вишневая свадьба”, а таксама іншыя мерапрыемствы.

*Витебские вести. – 2014. – 22 июля. – С. 5.*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

**IV купальскае свята “Александрыя збірае сяброў”** прайшло **6–7 ліпеня** ў Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці. У маляўнічым месцы на беразе Дняпра разгарнуўся “Александрыйскі кірмаш”, адбыліся тэматычныя майстар-класы, выстаўкі і экскурсіі, выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці. Дэлегацыя з Аршанскага раёна прадстаўляла нашу вобласць.

*http://mogilev-region.gov.by/tags/aleksandriya_sobiraet_druzei%C2%BB*

**XXIII Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”**, які прайшоў з **10** па **14 ліпеня** стаў адным з самых запамінальных падзей Года гасціннасці і сабраў удзельнікаў з больш за 30 краін свету. Праграма фестывалю ўключала каля 80 мерапрыемстваў і 19 канцэртных праграм, у тым ліку два начныя канцэрты, і выйшла за рамкі афіцыйнай даты правядзення. Выступленні вядомых артыстаў у Летнім амфітэатры адбыліся з **8** па **16 ліпеня**. Сярод найбольш цікавых музычных мерапрыемстваў – юбілейная праграма “Вернулся я на Родину”, прысвечаная 100-годдзю Марка Фрадкіна, пры ўдзеле Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, а таксама джазавыя вечары і канцэрт, які прайшоў у рамках Дня дружбы **13 ліпеня**.

У гэтым годзе змяніўся і фармат правядзення міжнароднага

конкурсу выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2014”: з 21 удзельніка паўфіналу толькі 15 атрымалі права выступіць у фінальным канцэрце.

У час форуму былі ўзнагароджаны лаўрэаты прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва: беларускі скульптар *Іван Міско*, мастацтвазнавец *Інэса Слюнькова* і народны артыст СССР *Уладзімір Зельдзін*.

Вядомая Алея лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі “Через искусство – к миру и взаимопониманию” папоўнілася зоркай народнай эстраднай спявачкі Надзеі Бабкінай.

У гэтым годзе афармленне галоўнай сцэнічнай пляцоўкі дапоўнілі спецэфекты, якія выкарыстоўваліся ў час “Еўрабачання” і Алімпіяды-2014 у Сочы. Акрамя таго, у летнім амфітэатры былі ўсталяваны святлодынамічныя фантаны.

Па выніках конкурсных выступленняў прысвоена званне “Лаўрэат Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2014»”, уручаны дыпломы, спецыяльныя прызы (аўтар В. Магучы) і прысуджаны наступныя прэміі: Гран-пры – *Радрыга дэ ла Кадэна* (Мексіка), І прэмія – *Віталіе Негруца* (Малдова), ІІ прэмія – *Вераніка Дораш* (Украіна) і *Дзіно* (Харватыя), ІІІ прэмія – *Дзіяна Голбі* (Ізраіль) і *Мархаба Сабіева* (Казахстан).

Традыцыйна Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі ўзнагародзіў выканцаў з Расіі і Беларусі – *Злата* і *Артура Міхайлава*.

**Спецыяльная прэмія імя Уладзіміра Мулявіна** прысуджана за лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і высокае выканальніцкае майстэрства канкурсанту з Латвіі *Емілсу Балцэрысу*.

Па выніках конкурсных выступленняў прысвоена званне “Лаўрэат Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2014»” і ўзнагароджаны спецыяльнымі прызамі “Лира” (аўтар В. Магучы): Гран-пры – *Анастасія Багінская* (Украіна), І прэмія –*Зінаіда Купрыяновіч* (Беларусь), ІІ прэмія – *Лізі Шаўгулідзе* (Грузія) і *Андрэй Бойка* (Украіна), ІІІ прэмія – *Міка* (Арменія).

Узнагароджаны спецыяльнымі прызамі Парламенцкага Сходу



***Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**22** і **27 ліпеня** Экалагічная вандроўка “Страна непуганых зверей”, прысвечаная Дню запаведнікаў і нацыянальных паркаў” (*бібліятэка імя К. Сіманава*).

**3 ліпеня** Канцэрт-віншаванне “І гонар, і слава – мая Беларусь!” (*дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна*).

З **1** па **7 ліпеня** чытачы *бібліятэкі імя У. Караткевіча* мелі магчымасць пазнаёміцца з кніжнай экспазіцыяй “Старонкі гэтых кніг – гісторыя вайны”, прысвечанай 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таксама ў гэтыя дні супрацоўнікі бібліятэкі правялі акцыю “Рядом с нами живет ветеран”.

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка***

**10 ліпеня** Краязнаўчая вандроўка “Вёска, у якой ты жывеш” (*Курынская сельская бібліятэка*).

**16 ліпеня** Чытацкі марафон “Летом некогда скучать – книги будем мы читать!” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**17 ліпеня** Сустрэча з пісьменніцай *А. Лазебнай*, паэтамі *М. Даргелем* і *А. Гінько*, бардам *С. Лузгіным* і кампазітарам *В. Шавяковым* (*Кіраўская сельская бібліятэка*).

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**19 ліпеня** Вусны часопіс “Мой край – майго сэрца любоў”, прысвечаны 90-годдзю ўтварэння Гарадоцкага раёна (*Пальмінская сельская бібліятэка*).

**23 ліпеня** Паход да вайсковых могілак для дзяцей са спартыўнага лагера “Прыазёрны” “Никто не забыт, ничто не забыто” (*Прудніцкая сельская бібліятэка*).

**25 ліпеня** Інфармацыйная гадзіна “Аб песнях і героях кніг, якім пастаўлены помнікі” для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту (*Езярышчанская дзіцячая бібліятэка*).

*Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк*

**3 ліпеня** Свята кнігі “Красуй наш Віцебск сёння і заўжды”, прысвечанае Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага, дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака*). На свяце былі прадстаўлены кніжныя выстаўкі “Віцебшчына – край подзвігу і славы”, “Віцебская спеўная зямля”, выстаўка дзіцячых кніг “Лета пад кніжным парасонам”, працавала “Летняя чытальная зала”. Наведвальнікам былі прапанаваны віктарыны “Ці ведаеце вы гісторыю Віцебска?”, “З якой я кнігі?”, жартоўныя літаратурныя гаданні, акцыя “Букросінг. Адпраў кнігу ў падарожжа”.

**2 ліпеня** ў *бібліятэцы імя Я. Купалы* да Дня Незалежнасці і 1040-годдзя Віцебска была адкрыта экпазіцыя творчых работ наведвальнікаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна г. Віцебска з абмежаванымі магчымасцямі “Град, парящий над Двиной” (вышываныя карціны). А таксама фотавыстаўка чытача бібліятэкі *В.М. Барысенкі* “Віцебск на скрыжаваннях стагоддзяў”. На прэзентацыі выставак з канцэртнай праграмай выступіла вакальная група “Ліра” ВДУ імя П.М. Машэрава.

**2–10 ліпеня** Цыкл гутарак з мультымедыйнай прэзентацыяй “Званы Хатыні” для навучэнцаў школьных аздараўленчых лагераў устаноў адукацыі г. Віцебска (*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай*).

**4 ліпеня** Вечарына-ўспамін “Маленькія гісторыі пра вялікую вайну” (*бібліятэка імя І. Крылова*).

**28 ліпеня** супрацоўнікі *бібліятэкі № 8* прынялі ўдзел у свяце “Ільін дзень”, што адбылося ў музеі-сядзібе Ільі Рэпіна “Здраўнёва” і было прысвечана 170-годдзю з дня нараджэння вядомага рускага мастака. Бібліятэкары прапанавалі гасцям кніжную выстаўку, прысвечаную жыццю і творчасці І.Я. Рэпіна, агляд літаратуры і інфармацыйную гутарку “Рэпін – пісьменнік”.



Саюза Беларусі і Расіі лепшаму выканаўцу ад Рэспублікі Беларусь і лепшаму выканаўцу ад Расійскай Федэрацыі Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2014” *Мілана Рэдчанка* і *Марыя Ермалаева*.

У фестывальным Віцебску з **9** па **15 ліпеня** прайшоў традыцыйны кірмаш народных рамёстваў і мастацтва “Горад майстроў”, удзел у якім прынялі каля 250 майстроў з Беларусі, Расіі, Украіны і Латвіі.

**Святы ганчарнага майстэрства “Чароўная гліна”** і **мастацкай апрацоўкі дрэва “Фантазия рельефа”** сабралі ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”» майстроў Прыдзвіння і іншых рэгіёнаў Беларусі. Майстры з Віцебскай, Мінскай і Маскоўскай (Расійская Федэрацыя) абласцей запрашалі на свята **кузнечнага майстэрства “Круг друзей”**.

Больш за 50 творцаў прынялі ўдзел у **абласным свяце-конкурсе майстроў традыцыйнага і сучаснага мастацкага роспісу “Фарбы нябёсаў”**, якое прайшло **12–13 ліпеня** ў краязнаўчым музеі. У гэтай жа ўстанове з **4** па **31 ліпеня** працавала **абласная выстаўка маляванак народнага дэкаратыўнага жывапісу “Краскі Паазер’я”.**

Новы праект “Кукольный квартал” прадставіў на фестывалі лаўрэатаў “Золотой Маски” і прэстыжных конкурсаў – спектаклі з гарадоў Санкт-Пецярбург, Яраслаўль, Гродна і Віцебска.

Таксама прайшлі мерапрыемствы **Дня моладзі (11–12 ліпеня)**, у ліку якіх маладзёжная праграма “Музычная бітва дзіджэяў”, фестываль маладзёжных субкультур з правядзеннем майстар-класаў, парад маладзёжных субкультур “БелаРусь в Сердце Моем!”, патрыятычная акцыя “Спасибо за жизнь!”, міжнародны маладзёжны фестываль “Агонь танца-2014”.

У рамках “Славянскага базару” прайшоў **XI Міжнародны фестываль творчасці інвалідаў “Віцебск-2014”**. 38 удзельнікаў, якія занялі прызавыя месцы ў розных намінацыях конкурсу, прадставілі свае творчыя нумары ў час гала-канцэрта ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”».

*http://fest-sbv.by/contacts/festival.html*

**18** і **19 ліпеня** ў аграгарадку Ноўка адбыліся ўрачыстасці ў гонар **90-годдзя Віцебскага раёна**. З гэтай нагоды адбыліся наступныя мерапрыемствы: выстаўка “Прыдзвінскі край. Гісторыя і сучаснасць” у РДК, тэатралізаванае шэсце “Славім цябе, прыдзвінскі край!”, святочны канцэрт з удзелам заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Ірыны Дарафеевай і фіналістаў тэлепректа “Акадэмія талентаў” – “Сэрца зямлі маёй” (РДК), працаваў Горад майстроў “Таленты Віцебскай зямлі” і інш. У в. Должа адбылося спартыўна-забаўляльнае свята “Спартыўныя, здаровыя, вясёлыя!”, на пляжы возера Сосна прайшоў Дзень Нептуна. Павіншаваць суседзяў прыехалі дэлегацыі Смаленскай і Пскоўскай абласцей Расійскай Федэрацыі.

*Витебский проспект. – 2014. – 15 июля. – С. 4.*

**19 ліпеня** ў г. п. Лёзна прайшоў **абласны фестываль-конкурс самадзейных кампазітараў і паэтаў “Песні сунічных бароў-2014”**, прысвечаны Году гасціннасці. Удзел у конкурсе прынялі сорак індывідуальных выканаўцаў і калектываў з розных куткоў Прыдзвіння. Былі на фестывалі і госці з Расіі – прадстаўнікі гарадоў Рудня і Ельня Смаленскай вобласці.

Лаўрэатам 1-й ступені сярод паэтаў сталі *Алена Басікірская* (Міёрскі раён) і *Тэрэса Крумплеўская* (Браслаўскі раён), 2-й ступені – *Віктар Сяднёў* (г. Рудня, Смаленская вобласць), 3-й – *Ларыса Новікава* (г. Орша), *Наталля Васілевіч* (г. Новалукомль) і *Таццяна Макалевіч* (Лёзненскі раён).

Сярод кампазітараў Гран-пры конкурсу заваяваў *Аляксандр Дзямідчык* (Чашніцкі раён). Лаўрэат 1-й ступені *Яўгенія Букоціна-Ісупава* (г. Наваполацк), 2-й ступені – *Аксана Анікеева* (Дубровенскі раён), 3-й – *Аляксей Краўцоў* (г. Орша) і *Віктар Малых* (г. Полацк).

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 24 июля. – С. VI.*

З **24** па **27 ліпеня** на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна дзейнічаў **XXIII Міжнародны маладзёжны лагер “Бе-La-Русь-2014”**. У гэтым



годзе арганізатарам маладзёжнага форуму выступіла Расія. Прапанаваная тэма – “Культурная рэвалюцыя” – прымеркавана да Года культуры, які аб’яўлены ў Расійскай Федэрацыі.

*http://www.sb.by/soyuz-belarus-rossiya/article/vse-budet-kulturno-167634.html*

*Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2014. – 5 жн. – С. 2.*

**26–27 ліпеня** адбыўся **Міжнародны спартыўна-музычны фестываль “Viva Braslav”**. У яго рамках прайшлі турнір па пляжным футболе і валейболе сярод мужчынскіх і жаночых каманд, спаборніцтвы сярод аматараў байдарачнага спорту, парусная рэгата. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы Браслава адбыўся канцэрт, на якім выступілі вядомыя артысты і творчыя калектывы. Хэдлайнер вечара – папулярная беларуская група “Без білета”.

*http://zviazda.by/2014/07/44767.html*

З **31 ліпеня** па **5 жніўня** на базе праваслаўнага маладзёжнага лагера “Дружба” (Віцебскі раён) у гэтым годзе праходзіў **XII маладзёжны фестываль “Адзігітрыя”**. У час фестывалю адбыліся майстар-класы па калакольным звоне, тэатральным мастацтве, харэаграфіі, песенны конкурс. Завяршылася свята хрэсным ходам, які пачаўся 5 жніўня і завяршыўся 10 жніўня ў г. Смаленску святам іконы “Адзігітрыя”.

*Витебский проспект. – 2014. – 24 июля. – С. 4.*

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**12 ліпеня** Акцыя “Читальный зал под небом голубым” для навучэнцаў школьных аздараўленчых лагераў устаноў адукацыі г. Віцебска (*аддзел дзіцячай літаратуры*).

**17 ліпеня** Конкурс малюнкаў на асфальце “Мы за мир” (*аддзел дзіцячай літаратуры*).